Выдаецца з 16 студзеня 1998 г.
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя газеты НАВІНЫ
Наклад 21 300.
Адрас для карэспандэнцыі:
220088, г.Мінск,вул. Іванаўская, 56.
Тэл/факс: 236-89-40

НАВІНЫ



Пятніца, 11 снежня 1998 г. № 134 (526) Кошт свабодны

СВАБОДА

Забаронена 24 лістапада 1997 г.

У Мінск прыбывае прэзідэнт Кучма

Сёння ў Мінск прыбывае з рабочым візітам прэзідэнт Украіны Леанід Кучма.

Падчас перамоваў з прэзідэнтам А.Лукашэнкам плануецца разгледзець пытанні аб пастаўках у Беларусь украінскай мукі ў абмен на прадукцыю Мінскага трактарнага завода. 12 снежня Леанід Кучма мае намер правесці ў Брэсце. Там ён возьме ўдзел у нарадзе кіраўнікоў мясцовых органаў улады, кіраўнікоў прадпрыемстваў дзяржаўнай і недзяржаўнай форм уласнасці прыгранічных раёнаў Беларусі і Украіны.

БелаПАН

Прэмія знайшла Шарамета



У аўторак у Мінску адбылася цырымонія ўручэння міжнароднай прэміі Паўлу Шарамету.

Як вядома, беларускія ўлады не выпусцілі журналіста за мяжу, каб атрымаць узнагароду. Таму ў Мінск спецыяльна прыехалі з Нью-Йорка дзве прадстаўніцы Міжнароднага камітэта абароны журналістаў, каб уручыць прэмію дома. Праўда, ніякіх грошай Павел не атрымаў, бо прэмія мае характар выключна маральнай узнагароды.

Язэп СІНІЦКІ

Цэнтрвыбаркам не ў курсе

Лідзія Ярмошына заявіла, што Цэнтрвыбаркам «не мае ніякай інфармацыі» аб магчымых прэзідэнцкіх выбарах у 1999 годзе

Старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына расцэньвае заявы некаторых беларускіх палітыкаў аб іх гатоўнасці балаціравацца ў 1999 годзе на пост прэзідэнта рэспублікі, што з'явіліся апошнім часам у прэсе, як *«падрыхтоўчую, папярэднюю рэкламную кампанію цалкам магчымых кандыдатаў у прэзідэнты»* на выбарах у 2001 годзе. Пра гэта Л.Ярмошына заявіла 8 снежня падчас сустрэчы з журналістамі.

Па словах Лідзіі Ярмошынай, Цэнтрвыбаркам *«не мае ніякай інфармацыі»* аб тым, што ў 1999 годзе ў Беларусі адбудуцца прэзідэнцкія выбары і ніякая падрыхтоўчая праца да іх не вядзецца. Да таго ж, як адзначыла старшыня ЦВК, да гэтых выбараў «не гатовы» і закон аб выбарах прэзідэнта, які трэба прывесці ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Беларусі ў рэдакцыі 1996 года.

БелаПАН

Шарэцкі з'ездзіў у Літву

У мінулую сераду дэлегацыя Вярхоўнага Савета Беларусі на чале з Сямёнам Шарэцкім пабывала з візітам у Літоўскай Рэспубліцы.

Як падкрэсліў у гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН напярэдадні ад'езду Сямён Шарэцкі, гэтаму візіту быў нададзены афіцыйны статус. *«Нас запрасіў наведаць Літву старшыня Сейма Літоўскай Рэспублікі Вітаўтас Ландсбергіс»*, — паведаміў С.Шарэцкі. Акрамя спікера, у склад дэлегацыі ўваходзілі Генадзь Карпенка, Анатоль Лябедзька, Уладзімір Ніцюк, Алена Скрыган і Станіслаў Шушкевіч.

Уладзімір ГЛОД

Святочны ўказ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб святкаванні 80-х угодкаў з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Ураду краіны даручана стварыць Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў, а таксама вызначыць крыніцы фінансавання.

Нагадаем, што Маніфест аб утварэнні БССР быў апублікаваны Часовым рабоча-сялянскім савецкім урадам Беларусі 1 студзеня 1919 года. Як дзяржаўнае ўтварэнне БССР існавала да верасня 1991 года, калі Вярхоўны Савет БССР заканадаўча афарміў новую назву краіны — Рэспубліка Беларусь.

БелаПАН

Рынкі бастуюць

Магілёўскія гандляры з рэчавых рынкаў правялі аднадзённы страйк.

Як паведаміў кіраўнік мясцовага прафсаюза прадпрымальнікаў Сяргей Фамін, у страйку ўдзельнічалі амаль 1.000 чалавек. Не працавалі два рынкі, а на самым вялікім, стадыёне «Спартак», гандлявалі каля трэці ад звычайнай колькасці палатак.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

«Шырокі доступ» у Дразды

Учора на прэс-канферэнцыі міністра замежных справаў Урала Латыпава быў распаўсюджаны тэкст двухбаковай заявы па ўрэгуляванні «драздоўскай» праблемы.

Дакумент падпісалі ў сераду намеснік міністра Уладзімір Герасімовіч і эмісар Еўрапейскага саюза Дзітмар Штудэман.



Урал Латыпаў.

Беларускі бок гатовы на адзін месяц адкрыць *«шырокі доступ паслоў да сваіх рэзідэнцыяў на тэрыторыі комплекса ў Драздах, каб яны вызвалілі памяшканні»*. Словам, афіцыйны Мінск згадзіўся даць месяц на зборы. Як толькі паслы паведамяць, што выселіліся з рэзідэнцыяў, *«існуючыя дамовы аб арэндзе будуць лічыцца несапраўднымі»*. Беларускія ўлады паабяцалі *«актыўна садзейнічаць»* у заключэнні новых пагадненняў аб арэндзе.

Пакуль, аднак, невядома, як адрэагуюць краіны ЕС на прапановы афіцыйнага Мінска. Новы міністр спадзяецца на вяртанне паслоў у Беларусь і вырашэнне праблемы «ў кароткі тэрмін».

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Дапамога

Сем вагонаў з гуманітарнай дапамогай адпраўленыя ўчора з Мінска на Сахалін.

Саюз

Сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая мелася адбыцца 14 снежня ў Мінску, перанесеная на больш позні тэрмін.

Рэкорд

Днямі ў Гомелі быў пастаўлены своеасаблівы рэкорд: суд пастанавіў спагнаць з натарыуса Людмілы Васільевай ажно 1 мільярд 115 мільёнаў рублёў.

Канфіскацыі

Магілёўская міліцыя канфіскавала ў Клічаўскім раёне 103 самагонныя апараты. Гэта на 32 больш, чым у мінулым годзе. Большасць сучасных самагоншчыкаў — пенсіянеры.


Ці можна пражыць на 14 долараў?

За 11 месяцаў гэтага года максімальны памер пенсіі ў Беларусі ў пераліку па рынačным («чорным») курсе наяўнага долара знізіўся ў 2,9 раза — з 40 да 14 долараў.

Дынаміка выглядае наступным чынам: снежань 1997 года — 40 долараў, студзень 1998 года — 37, люты — 43, сакавік і красавік — 36, май — 34, чэрвень — 33, ліпень — 36, жнівень — 33, верасень — 24, кастрычнік — 16, лістапад — 14 (пры разліках браўся курс на 15-е число кожнага месяца).

У лістападзе максімальны памер пенсіі быў роўны 2,645 мільёна рублёў.

Зміцер САЛАЎ



Даеш 100 долараў!

Стыхійная 40-хвілінная забастоўка адбылася ў сераду на заводзе «Брэстсельмаш». У ёй удзельнічала больш як 100 рабочых.

Працоўныя правялі агульны сход, на якім падтрымалі патрабаванні Свабоднага прафсаюза павялічыць мінімальную зарплату да 100 долараў у месяц і прадаставіць лідэрам прафсаюза тэлеэфір. Рэзалюцыя сходу перададзена ў заводскую адміністрацыю.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Расія гуляе

12, 13 і 14 снежня абвешчаныя ў Расіі выхаднымі днямі

12 снежня ў Расіі афіцыйна адзначаецца Дзень Канстытуцыі.

Сёлета гэты дзень прыпаў на суботу, гэта значыць, з'яўляецца адначасова выхадным і святочным днём. У такіх выпадках, паводле расійскага закона, выхадны пераносіцца на наступны пасля свята працоўны дзень — 14 снежня.

Беларусам нічога не застаецца, як пазайздросціць расіянам. Асабліва калі ўлічыць, што ў 1999 годзе з дзевяці святаў, якія афіцыйна адзначаюцца ў Беларусі, пяць прыпадаюць якраз на выхадныя дні.

Б.П.

Малады Фронт рыхтуе аўтапрабег

Малады Фронт у сярэдзіне студзеня 1999 года плануе правесці аўтапрабег па ўсіх абласцях Беларусі — «Беларусь у антыдыктатарскім коле».

Як сказаў кіраўнік спартыўнай камісіі Маладога Фронту Яўген Скочка, пачатак двухтыднёвага прабегу запланаваны на 12 студзеня, аднак у залежнасці ад надвор'я дата можа быць зменена. У акцыі возьмуць удзел некалькі дзесяткаў актывістаў «МФ» на легкавых аўтамабілях і мікраўтобусах. На машынах будзе ўстаноўлена нацыянальная сімволіка і лозунгі ў падтрымку палітзняволеных, з патрабаваннем выканання правоў чалавека ў Беларусі, у падтрымку нацыянальнай культуры і мовы. Асноўныя гарады, па якіх прызначаны прабег, — Мінск, Маладзечна, Ліда, Гродна, Ваўкавыск, Слонім, Баранавічы, Кобрын, Брэст, Пінск, Столін, Мазыр, Гомель, Магілёў, Орша, Віцебск, Полацк, Наваполацк, Барысаў.

БелаПАН



Спадар Чыгір, рана піць шампанскае!

Лідэры беларускіх палітычных партыяў па-рознаму расцанілі рашэнне былога прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Чыгіра вярнуцца ў вялікую палітыку і ўключыцца ў барацьбу за пасаду прэзідэнта краіны.

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады Станіслаў Шушкевіч ухваляе намер М.Чыгіра змагацца за прэзідэнцкае крэсла. *«Чыгір — вельмі дастойны і вельмі прыстойны чалавек, які мае вопыт кіравання дзяржавай, ведае эканоміку і банкаўскую справу. Шансаў стаць прэзідэнтам у яго больш, чым у каго б там ні было»,* — сказаў Шушкевіч. На ягоную думку, адзіны сур'ёзны недахоп Чыгіра — адсутнасць харызмы, што, аднак, *«з'яўляецца справай нажыўной».*

Лідэр партыі Станіслаў Багданкевіч таксама лічыць Чыгіра «дастойнай фігурай». Па яго словах, у актыве былога прэм'ера — паспяховая дзейнасць на пасадзе старшыні Савета міністраў, а таксама прынцыповая пазіцыя ў адносінах да рэферэндуму 1996 года. У той жа час, на думку Багданкевіча, урад Чыгіра не здолеў адстаяць курс рэформаў. Акрамя таго, заява экс-прэм'ера пацягне за сабой чарговае драбленне дэмакратычных сілаў. *«У нас ужо ёсць кандыдат у прэзідэнты — Генадзь Карпенка, шансы якога выглядаюць зараз больш пераважнымі»,* — сказаў Багданкевіч.

Як заявіў выконваючы абавязкі старшыні БНФ Лявон Баршчэўскі, пры ўсёй павазе да былога прэм'ер-міністра, ён нясе долю адказнасці за цяперашні крызіс у Беларусі і аднабаковую арыентацыю яе эканомікі. На думку Баршчэўскага, чуткі аб падтрымцы Чыгіра пэўнымі палітычнымі коламі Расіі могуць мець пад сабой «рэальную глебу». Аднак шансы на перамогу будзе мець той, хто *«арыентуецца не на Маскву, а на свой народ».*

На думку старшыні сацыял-дэмакратычнай партыі Народная Грамада Мікалая Статкевіча, у заяве Чыгіра няма нічога выбітнага. *«Гэта не больш чым яшчэ адна кандыдатура на пасаду прэзідэнта, і каментары тут залішнія»,* — лічыць Статкевіч.


Першы сакратар КПБ Віктар Чыкін заявіў, што імя наступнага прэзідэнта ўжо вядома — гэта Аляксандр Лукашэнка. Астатнія, па словах Чыкіна, — «другая ліга».

БелаПАН

Сала нясіце, а кнігі забярыце

Юрый Хадыка і Алесь Бяляцкі асуджаныя за арганізацыю мітынгу, прысвечанага 50-годдзю Дэкларацыі правоў чалавека, знаходзяцца пад арыштам у мінскім спецпрыёмніку на вул.Акрэсціна

8 снежня адміністрацыя спецпрыёмніка адмовілася прыняць падручнік англійскай мовы для старшыні праваабарончага цэнтра «Вясна-96» Алеся Бяляцкага, асуджанага на 10 сутак арышту.



А.Бяляцкі.

Алесь Бяляцкі планаваў скарыстаць час зняволення з карысцю — для павышэння ўзроўню сваіх ведаў. Але з гэтага нічога не атрымалася, бо інструкцыя забараняе перадаваць «сутачнікам» кнігі. Каўбаса, сала, фрукты і прадметы асабістай гігіены, прынесеныя для 7-мі асуджаных, не выклікалі пярэчанняў з боку адміністрацыі і былі прынятыя. Апрача гэтага, усе асуджаныя атрымалі свежую прэсу, якая прайшла праверку (перадаваць дазваляецца толькі тое, што можна набыць у кіёсках «Белсаюздруку»).

Як паведаміў прэс-цэнтр «Вясны-96», усе сем асуджаных спачатку знаходзіліся ў адной камеры, якая разлічаная на дзесяць чалавек. Потым Валерый Шчукін, добра вядомы супрацоўнікам размеркавальніка як аўтар цыкла артыкулаў, прысвечаных умовам утрымання на Акрэсціна, быў пераведзены ў іншую камеру.

Мікола СЦЕПАНЕНКА

Васіль Старавойтаў у турме захварэў

Судовы працэс над былым кіраўніком «Рассвета» Васілём Старавойтавым часова прыпынены

«У Васіля Старавойтава абвастрыўся хранічны бранхіт, каб не запускаць хваробу, яго вырашана падлячыць. Але праз 3–4 дні працэс адновіцца», — паведаміла нам суддзя Надзея Чмара. Прычынай захворвання суддзя назвала «перапады тэмпературы», але ўмовы ўтрымання Старавойтава, паводле яе словаў, добрыя: у камеры 19 градусаў цяпла, і сядзяць у ёй не 12 чалавек, як звычайна, а толькі чацвёра.

Між тым, сам Васіль Старавойтаў заяўляе, што ў турме не больш 10 градусаў, таму ён пастаянна мерзне.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Савет міністраў шукае грошы

Дзяржаўным установам і арганізацыям забаронена набываць аўтамабілі і мэблю за бюджэтныя сродкі.

Учора ў дзяржаўнай прэсе з'явілася пастанова Савета міністраў «Аб эканоміі дзяржаўных сродкаў».

Урад забараніў усім бюджэтным установам і арганізацыям набываць аўтамабілі, мэблю, гаспадарчы інвентар і абсталяванне, а таксама фінансаваць «неперашачарговае» будаўніцтва і рамонт да канца 1998 года. Абмежаванні таксама датычаць замежных камандзіровак чыноўнікаў, у тым ліку і ў краіны СНД.

Міхась КАРПОВІЧ

Бензінавы «голад»

Ужо каля трох тыдняў у Магілёве працягваецца бензінавы «голад».

Бензінам забяспечваюцца толькі жыццёва важныя службы — «хуткая дапамога», пажарныя і міліцыя. А ўсе астатнія гадзінамі «дзяжураць» на аўтазапраўках з надзеяй купіць каштоўныя літры гаручага.

БелаПАН

Яйкі з рук

Мінскія бабулі асвойваюць новы бізнес

Прастаяўшы ў чарзе за яйкамі і купіўшы дэфіцытны прадукт, бабулі тут жа перапрадаюць тавар у тры разы даражэй. Дзесятак яек каштуе ўжо ў іх 150 тысяч рублёў. Найбольш прадпрымальным удаецца за дзень зарабляць такім чынам да паўмільёна «зайцоў».

Б.П.

Партыі чакае перарэгістрацыя?

Як нам стала вядома з крыніцаў у міністэрстве юстыцыі, гэтае ведамства распрацоўвае праект новага ўказа прэзідэнта наконт палітычных партыяў.

У адпаведнасці з указам, усе партыі падлягаюць перарэгістрацыі з 1 студзеня па 1 сакавіка 1999 г. Падлягаюць усе, але перарэгіструюць не ўсіх.

Для таго, каб паспяхова прайсці працэдуру, партыя павінна мець у сваіх шэрагах не менш за 1.200 членаў. Ёсць і такая пікантная дэталь: кожная партыя, якая захоча перарэгістравацца, павінна будзе заплаціць адпаведны ўзнос. Ягоны памер складае 10 тысяч долараў (у валюце ці ў рублёвым эквіваленце — пакуль невядома).

Нагадаем, што ў 1991 годзе, калі ў Беларусі зараджалася шматпартыйная сістэма, рэгістрацыйны ўзнос вымяраўся досыць сімвалічнай сумаю, а мінімальная колькасць членаў, патрэбная для стварэння партыі, складала 100 чалавек. На сённяшні дзень патрабуецца, каб у партыі было не менш за 500 «штыкоў». Цяпер планку падымуць яшчэ вышэй.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

КАДРЫ



9 снежня на плошчы Якуба Коласа ў Мінску адбыўся пікет, арганізаваны Беларускім Народным Фронтам, акцыя была накіраваная супраць аб'яднання Расіі і Беларусі.

Все шестеро погибли

«Комсомольская правда» сообщила подробности кровавой трагедии, разыгравшейся в понедельник вечером на 348-м километре автодороги Москва—Беларусь, возле города Ярцево, районного центра Смоленской области

Около 18 часов вечера дорожные рабочие заметили на обочине шоссе микроавтобус «Мерседес» с белорусскими номерами, уже припорошенный снегом и признаков жизни не подававший. К ручке двери автобуса тянулась проволока и было прикреплено гранатное кольцо. Вызванные дорожниками сотрудники ярцевского РОВД, не вскрывая автобуса, обнаружили, что в салоне кто-то есть. Не было сомнений в том, что «Мерседес» заминирован. Вызвали групу саперов из Смоленска.

Прибывшая во вторник утром бригада ОМОНа вскрыла одну дверь автобуса. На средних сиденьях вповалку лежали четыре человека. Еще двоих обнаружили в грузовом отсеке. Здесь же стояли шесть канистр с бензином, возле которых была поставлена гранатная «растяжка» — взрывной механизм замедленного действия. Обезвредив гранату, омоновцы извлекли трупы и убрали подальше от автобуса бензин.

Когда попытались обезвредить второе взрывное устройство, механизм сработал и через несколько секунд автобус взорвался. Никто из омоновцев не пострадал. По их оценке, взорвалось около двухсот граммов тротила.

Кто расстрелял пассажиров микроавтобуса, а потом его заминировал, пока неизвестно. Основная версия убийства — ограбление.

Известно, что все шестеро (среди которых одна женщина) — предприниматели из Гродно. Их личности установлены. Ранения, обнаруженные на телах, — огнестрельные и ножевые. По мнению специалистов, взрывной механизм, установленный в автобусе, мог соорудить маломальски соображающий в подрывных делах человек.

Екатерина СЕБЕЖ, Андрей ЕВСЕЕНКОВ

Катафалк з-за мяжы

З вялікімі праблемамі сутыкнуліся сябры і родныя 32-гадовага жыхара Брэста Аляксандра К., які паехаў на заробкі ў Галандыю і там нечакана памёр.

Каб даставіць цела нябожчыка на радзіму, родным трэба было заплаціць 6 тысяч долараў.

Пасля доўгіх пошукаў удалося знайсці польскую фірму, якая згадзілася транспартаваць труну з Галанды ў Беларусь за 2 тысячы «зялёных». Сваякі і калегі Аляксандра хоць і з цяжкасцямі, але «наскрабілі» неабходную суму. Дапамагло і таварыства глухіх, членам якога быў нябожчык. Катафалк забраў труну з целам, без праблем пераадолеў межы заходніх краінаў, але на граніцы ў Брэсце загруз — беларускія мытнікі не хацелі прапускаць «груз-200» без чаргі.

Язэп СІНІЦКІ

«Макдональдс»:

Два года в Минске

10 декабря исполняется два года со дня открытия первых двух ресторанов «Макдональдс» в Беларуси.

Сегодня «Макдональдс» не может похвастать высоким притоком посетителей, многих из которых отпугивают высокие цены: Биг Мак стоит 407 тыс. рублей, фишмак — 303 тыс., чизбургер —189 тыс. Минимальная зарплата составляет в Беларуси, как известно, 350 тыс.рублей.



На снимке: посетитель рассматривает ценники в ресторане «Макдональдс» в Минске.

Палацы ідуць з малатка

За рэкордную суму прададзены на аўкцыёне ў Віцебску будынак былога Палаца культуры

Двухпавярховы будынак плошчай 1.624 квадратныя метры, пабудаваны ў 1957 годзе, купілі бізнесмены, якія пажадалі застацца невядомымі, за 5 мільярдаў 360 мільёнаў рублёў, у той час як пачатковая цана аб'екта складала 2 мільярды 354 мільёны рублёў. Новыя гаспадары плануюць адкрыць у будынку бізнес-цэнтр, дзе будуць офісы і гатэль высокага класа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Генпракурор расказвае пра замах на прэзідэнта

У інтэрв'ю ўрадавай газеце «Рэспубліка» Генеральны пракурор Беларусі Алег Бажэлка паведаміў аб расследаванні крымінальнай справы пра замах на прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку.

Па словах А.Бажэлкі, падчас расследавання справы аб забойстве Яўгена Мікалуцкага «было ўстаноўлена, што рыхтаваўся замах і на прэзідэнта Беларусі». З гэтай мэтай, па словах Алега Бажэлкі, вывучаліся маршрут руху кіраўніка дзяржавы, праца яго аховы, праводзілася праслухоўванне эфіру, рыхтаваліся сродкі для ажыццяўлення тэрарыстычнага акта, праводзіліся іх выпрабаванні, разлікі, *«колькі трэба ўзрыўчаткі для тэракта»*. Акрамя таго, вялася разведка мясцовасці непасрэдна каля рэзідэнцыі А.Лукашэнкі, былі падрыхтаваныя і вызначаныя выканаўцы для ажыццяўлення тэракта. *«Аднак,* — як адзначыў Генеральны пракурор, — *злачынная групоўка была раскрытая і абясшкоджаная. Здабытыя доказы пацвярджаюць вінаватасць асобаў, якія рыхтавалі гэты тэрарыстычны акт»*. Па словах А.Бажэлкі, расследаванне закончанае, абвінавачваемыя знаёмяцца з матэрыяламі справы, якая будзе слухацца, хутчэй за ўсё, на закрытым судовым паседжанні. Генеральны пракурор растлумачыў гэта тым, што ў матэрыялах справы закранаецца дзейнасць спецслужбаў.

Ю.ЗІНЦОЎ

Лісты ў рэдакцыю

НА УЛИЦАХ В МИНСКЕ часто можно увидеть бритоголовых юнцов, одетых в одинаковые черные куртки «пилот» и военные штаны. Они называют себя скинами — в подражание крупной английской неонацистской организации *Skin Head*. Их цель — «очистка» улиц города от всех лиц не европейского типа. Но все их действия сводятся лишь к бессмысленному избиению людей, как они говорят, не белых.

Наши доморощенные «скины» просто камуфлируют свою юношескую неуверенность этой формой и позаимствованными идеями. Самое страшное, что правоохранительные органы смотрят на все это сквозь пальцы, не предпринимают никаких активных действий. Конечно, эти партии не объединены пока в организованную структуру. Но в России, как известно, уже есть профашистские партии, например, Русское Национальное Единство. Их символика и листовки регулярно появляются и в Минске. Занимаются этим наши местные сторонники РНЕ. Но бдительные белорусские власти почему-то не замечают подобных вещей.

А.КОСТЕНЕВИЧ, А.БОРОВИЦКИЙ,
г.Минск

МОСКОВСКИЙ КРЕМЛЬ, выставив своего кандидата Михаила Чигиря на пост президента Беларуси, тем самым дает понять, что у Александра Лукашенко осталось совсем мало времени — только упаковаться да посидеть перед дальней дорогой. Увы, Александр Григорьевич, Москва вас сдала.

Анатолий КАХАНЧИК,
Полоцкий р-н, Витебская обл.

ХОТЕЛОСЬ БЫ, чтобы аналитики вашей газеты затронули тему предстоящих летом 1999 г. на Украине президентских выборов. Что будет, если победит красно-пророссийский кандидат (например, Петр Симоненко). Как это повлияет на ситуацию в нашей стране? Ведь такой поворот в политике Украины может привести к воссозданию СССР в несколько иной форме.

В.ЮРЕНЯ,
г.Барановичи Брестской обл.

НАША СЕМЬЯ давно выписывает вашу газету, и мы с удовольствием читаем практически все ваши материалы. Я прочитала в № 124 статью В.Вихляева «Мужские правила» и хотела бы на нее ответить. В целом статья мне понравилась, за исключением одного момента. Это там, где автор пишет: «Мужчина ждет от женщины инициативы. Это касается и бизнеса, и секса. Если вы заинтересованы в общении или контакте (я так поняла — интимном?) с мужчиной, скажите ему об этом прямо». Прямо — это как? Открытым текстом? Как в американских третьеразрядных видеофильмах, где суперсовременная, раскованная женщина говорит не менее современному мужчине: «Дорогой, давай займемся любовью!» Далее следует сцена с раздеванием, где именно женщина энергичными, заученными движениями раздевает мужчину, затем — сцена интимная, где также «ведет» женщина, а ее партнеру отведена лишь пассивная роль.

Это такой инициативы ждут от женщин настоящие мужчины? Неужели у этих самых «настоящих» настолько кишка тонка — разучились делать предложения интимного характера? Что, подсобить надо? И не стыдно вам, мужчины, вместо того чтобы хоть как-то попытаться завоевать женщину, ожидать, что она без всяких усилий с вашей стороны открыто станет навязываться к вам в постель?

Я не говорю, что женщина вообще не должна проявлять инициативу для сближения с понравившимся ей мужчиной. Но делать это следует не кавалерийским наскоком, а при помощи издавна известных каждой женщине приемов любовной игры (кокетство, намеки-полунамеки, соответствующая одежда — ну там, короткая юбка или наоборот длинная юбка с разрезом, волнующий запах духов и прочие эротические уловки). И если мужчина заметит это и откликнется на призыв, то после близости он будет чувствовать себя завоевателем, а не человеком, просто сделавшим кому-то одолжение. Конечно, переспать с женщиной, которая ведет себя подобно киношным американкам, можно по принципу «а почему бы и нет?» Правда, один мой знакомый уверяет, что бежит, как черт от ладана, от таких женщин, которые «сами вешаются на шею». Всерьез такая женщина вряд ли кого-нибудь заинтересует, ибо не ценится то, что легко доступно.

Хочется обратиться ко всем мужчинам теми самыми словами, которые автор статьи адресует женщинам: Господа, не ждите, чтобы вас позвали (в постель)! Ведь все старо, как мир — даже самая доступная и неразборчивая в связях женщина, порой открыто дающая понять, что ей от вас надо, все равно надеется, что «главные слова» скажете все-таки вы. Но если вы настолько инфантильны, что неспособны на эту малость, то никакие вы не «настоящие», и грош вам цена. Эдак вы можете до седых волос дожить в девственниках, ожидая, что женщины сами начнут прыгать к вам в постель со словами: «Дорогой, давай займемся любовью!» Не дождетесь!

До свидания. Желаю успехов газете НАВИНЫ.

И.ПЕТРОВА,
г.Минск

Адміністрацыя цісне

Гутарка з прафсаюзным лідэрам з Гродна

Анатоль Хацько — кіраўнік прафсаюза гродзенскага завода аўтаагрэгатаў, 40 гадоў. Ураджэнец Гродна. Усё жыццё, апроч службы ў войску, працаваў на заводзе наладчыкам абсталявання. У 1991 г. стаў членам страйкавага камітэта, пасля чаго быў абраны рабочымі ў прафкам. Быў адным з арганізатараў чатырохтысячнага мітынгу, які адбыўся ў Гродне ў мінулую суботу.

— Адміністрацыя аказвае ціск на прафсаюзнікаў?

— Старшыня прафкама тралейбуснага дэпо, які падпісаў заяўку на мітынг, потым вымушаны быў адклікаць свой подпіс. Напярэдадні акцыі віцэ-прэм'ер У.Замяталін накіраваў мясцовым уладам тэлеграму, каб яны правялі ў працоўных калектывах і з кіраўнікамі прафсаюзаў растлумачальную работу.

— Колькі зарабляюць на вашым прадпрыемстве?

— Сярэдні заробак — 7 мільёнаў 600 тысяч. У горадзе мы ніколі ніжэй сярэдняга ўзроўню у аплаце працы не апускаліся. Але нармальным для рабочага я лічу заробак у 200 долараў.

— Ці паўплываў на вашыя заробкі расійскі крызіс?

— Значна паўплываў, паколькі працэнтаў на 80 наша вытворчасць звязаная з Расіяй. Шмат працуем для маскоўскага АЗЛК, але гэта на сёння неплацежаздольнае прадпрыемства. Дапусцім, за аўтамабільныя амартызатары, якія мы прадавалі па 7—11 долараў, зараз расійскія партнёры прапануюць, напрыклад, па 3 долары. У выніку, усё больш працуем на бартэр, ну і на склад, канечне.

Гутарыў
Сяргей АСТРАЎЦОЎ

КАДРЫ



На здымку: у адной з вясковых крамаў пад Мінскам мясцовыя жыхары здаюць бутэлькі.

Где продукты – знают «комиссары»

Российские газеты пишут о том, как *«сотни белорусских граждан штурмуют магазины в надежде приобрести продукты питания»*. В некоторых райцентрах, сообщает газета «Сегодня», около очередей дежурят сотрудники милиции, власти ввели строгие ограничения на отпуск товаров в одни руки. Кроме того, дефицитные продукты питания отпускаются лишь по предъявлению паспорта с обязательной пропиской в районе нахождения той или иной торговой точки. Все граждане, выезжающие из страны, проверяются на предмет возможного вывоза продуктов питания. В случае, если «контрабанда» перевозилась личным транспортом, он реквизируется как «орудие преступления» и передается в доход государства.

Российские журналисты отмечают, что за последние две недели разительные изменения произошли в мировоззрении президента А.Лукашенко: если в середине ноября, в самый разгар кризиса, он возмущался действиями правительства, которое пыталось нормализовать обстановку путем резкого повышения цен в магазинах, то уже в конце месяца А.Лукашенко заметил, что цены повышаться будут, однако процесс этот *«должен носить не резкий, а «ползучий» характер»*.

Чтобы избежать серьезных социальных конфликтов, руководством республики было принято решение о создании института комиссаров, которые должны объяснить народу, почему были повышены цены и не хватает продуктов. Как сообщил заместитель главы президентской администрации И.Пашкевич, в каждом трудовом коллективе численностью свыше 300 человек введена должность замдиректора по информационно-воспитательной работе, которые будут помогать трудящимся «разбираться в политике». *«Проще говоря, «новые парторги» должны доходчиво объяснить простому белорусу, что все не так плохо, как ему кажется»*, — пишут «Известия» в номере за 4 декабря.

Российская пресса о Беларуси

Цены назначил «батька», а бьют продавца



В поисках «светлого будущего».

Охрана

Сообщая о кадровых перестановках в белорусских «верхах», газеты упоминают о снятии с должности начальника Службы безопасности президента Ю.Бородича и переводе его в КГБ. Источники отмечают, что, во-первых, на протяжении нескольких лет в структуре СБ отмечались происшествия, связанные с утерей оружия, употреблением спиртных напитков и большим количеством дорожно-транспортных происшествий. Газета «Сегодня» приводит несколько фактов. Один из личных телохранителей президента, получив новую квартиру, потребовал сделать ему евроремонт и демонстративно выбросил из окна сантехнику. Еще один президентский охранник подозревается в убийстве собственного отца.

Суд над Старовойтовым

Сообщая о начале судебного процесса над бывшим председателем колхоза «Рассвет» В.Старовойтовым, газета «Новые Известия» предполагает, что приговор ему будет вынесен не в совещательной комнате, а в гораздо более высоких кабинетах. Газета напоминает, что А.Лукашенко задолго до суда публично объявил В.Старовойтова преступником. Более того, сразу после ареста президент обвинил его в причастности к убийству могилевского чиновника Е.Миколуцкого и коррупционных связях с бывшим министром сельского хозяйства В.Леоновым. Ничего подобного следствию доказать не удалось.

Большинство наблюдателей склоняется к тому, что 73-летнего старика признают виновным, но выпустят на свободу, зачтя срок, уже проведенный под стражей. Пока же власти намерены контролировать освещение процесса, заявив, что количество представителей СМИ, которые получат доступ в зал заседаний, будет ограничено.


«Батька» обиделся

Как сообщают газеты, президент Лукашенко обиделся на российское ТВ за «огульную критику» белорусской действительности. Московские журналисты предполагают, что его возмутил показанный 1 декабря по каналу ОРТ сюжет о продовольственном кризисе в Беларуси. В частности, было взято интервью у продавщицы магазина, которая получила травму при сдерживании толпы, штурмующей прилавки.

Обзор подготовил **Андрей ПРОКАПОВИЧ**

Человек

Сергей ПУЛЬША



Согласно официальной статистике, в Беларуси зарегистрировано около 4.000 наркоманов. Учитывая легендарную славу одного только Светлогорска, цифра достаточно смешная. По рекомендации ВОЗ ее надо умножать на 10. Белорусские наркоманы советуют умножить как минимум на 50. Они утверждают, что наркотик пробовал каждый седьмой из поколения до 35 лет. Впрочем, «наркоманская» статистика завышена: вращаясь «в своем окружении», им кажется, что все вокруг такие же.

Транзитный коридор

Наркобизнес, как и любой бизнес, пользуется наиболее удобными путями доставки. Беларусь по причине своего географического расположения неизбежно должна была стать крупной перевалочной страной международной наркомафии. Через нас идут основные грузопотоки: из Европы в Россию (европейская синтетика типа «экстази» и *LSD*), из России в Европу — азиатский героин, из Украины в порты Прибалтики — каннабис и мак, из Прибалтики обратно — снова синтетика. При этом что-нибудь (и совсем не мало) неизбежно оседает в Беларуси.

Милиция достаточно регулярно объявляет о том, что задержаны выезжающие из Украины люди, у которых изъята либо конопля («шмаль»), либо маковая соломка. Юг Украины — основной регион поставок наркотиков этого типа в Беларусь. Они самые дешевые, в «сезон созревания» ими могут даже угощать бесплатно.

Западные наркотики — в основном героин и кокаин — наиболее распространены в Беларуси. Героин чаще всего у нас встречается польский. Но это не значит, что он там «вырос». Как и кокаин, в «чистом» виде он поступает в Польшу, где фасуется и разбавляется до «кондиции», потом поступает к нам по завышенным ценам. В Минске доза героина стоит $15, реальная цена за грамм (грамм уже считается оптовой партией) — $ 80-90. Милиция дает еще одну цифру — $120, но по словам наркоманов, это уже из области сказок. Грамм — это очень много, на нем можно «торчать» неделю, такими количествами его покупают редко, и это скорее исключение, чем правило.

Через Беларусь идут в основном небольшие партии: наркотики контейнерами не возят. Во-первых, это очень рисковое дело, а во-вторых — контейнером можно «убить» всех наркоманов бывшего СССР, а это нерационально.

Однако наиболее крупным поставщиком наркотиков в Беларусь являлось и до сих пор является родное государство.

Наркотики заказывали?

Наркотики в Беларусь поставляет венгерская компания «Гедеон Рихтер» через своего официального представителя в Беларуси — «Белфарм». Поставляемый ими кетамин используется в медицине в качестве наркоза. Причем в этом качестве используется только в бывшем СССР, весь остальной мир от него отказывается. Применение кетамина сопровождается гипертонусом, галлюциногенными явлениями.

В наших больницах кетамин не учитывается как наркотик. Форма хранения — «список А», то есть как обычный лекарственный препарат, возврат тары из-под которого не учитывается. Медсестра расписывается, что препарат получен, а куда он пошел — для больных или «налево», — это уже никого не интересует. Поэтому наркодилеры могут спокойно ждать, когда государство подбросит в медучреждения очередную партию, а потом уже завезенное можно легко украсть на месте.


Кетаминовая передозировка практически невозможна: медицинская доза в 3—4 раза больше «наркоманской». Крупнооптовая цена для наркоманов — 1 доллар за флакон 2 см кубических, мелкооптовая — 3,5—4 доллара, «уличная» продажная цена составляет 7—10 долларов.

Кетамин характеризуется тем, что не вызывает физической зависимости, не предполагает «ломок», но сопровождается мощнейшей психологической зависимостью.

Куда смотрит милиция?

Опиумные препараты среди зарегистрированных наркоманов употребляют 78%. Это наиболее опасный вид наркотика, вызывающий «ломки», передозировки, распад личности. Выявить «опиюшника» достаточно легко — варят «сырье» (обычно маковая соломка) на растворителе или ацетоне. Найти такого наркомана можно просто «по запаху». Процентов девяносто «опиюшников» работают на милицию, за это их и не любят все остальные наркоманы. Ломки настолько сильны, что «опиюшник» принимает любое предложение в обмен на «дозу».

Употребление кетамина, эфедрина или других медицинских наркотиков доказать практически невозможно. Варка идет в трубочке длинной в мизинец, от которой легко избавиться. Реакция на содержание в крови таких наркотиков очень дорогостоящая, а по истечении 48 часов следов кетамина в крови не остается вообще.



Этот наркоман согласился «уколоться» перед фотокамерой.

Исколотые вены — не показатель употребления наркотиков. Человек мог колоть себе глюкозу и витамины, ставить капельницу. Самая примитивная «отмазка», которой пользуются наркоманы и не попадают в лечебницу — мазохизм. Тоже выход. Тем более, что статья за употребление наркотиков в нашем законодательстве отсутствует. Нужно доказать, что наркоман хранит или продает наркотики. А доказать это сложно, в таких делах наркоманы крайне осторожны.

Статья «за распространение» считается у наркоманов «дурной» — до 8 лет с конфискацией и без права на амнистию. На этом редко кто попадается. Настоящие наркодилеры ни милиции, ни спецслужбам практически недоступны. Если такой дилер уходит от оптовика, на свое место он приводит надежного человека.

Швейцария

ВПЕРВЫЕ в истории президентом Швейцарской конфедерации в 1999 году будет женщина. 58-летняя представительница социал-демократической партии Рут Дрейфус была избрана на президентский пост на совместном заседании швейцарского парламента.

Валерия ШАБАЕВА

Азербайджан

ПОЗАВЧЕРА бывший премьер-министр Азербайджана Сурет Гусейнов заявил на процессе по его делу в Верховном суде, что в понедельник его пытались убить в тюрьме. По словам экс-премьера, утром 7 декабря в камеру в следственном изоляторе министерства национальной безопасности был пущен отравляющий газ. Гусейнов утверждает, что ему удалось избежать смерти лишь благодаря тому, что в тот момент он не спал и поэтому сумел тут же открыть форточку и вызвать надзирателей. Гусейнов обвиняется в том, что летом 1993 года и в октябре 1994 года он пытался организовать государственный переворот.

К.Д.

За што змагаліся?

Літоўскі бізнесмен адмовіўся ад дзяржаўнай узнагароды

Бізнесмен Далюс Басціс вырашыў адмовіцца ад ганаровага медаля ў знак пратэсту супраць надзвычай жорсткай палітыкі літоўскай дзяржавы ў дачыненні да малога бізнесу.

Далюс Басціс атрымаў свой медаль за тое, што ў ноч на 13 студзеня 1991 года абараняў літоўскі парламент ад савецкіх танкаў.

Як паведамляе агенцтва ELTA, новы закон аб малым бізнесе выклікаў вялікую незадаволенасць сярод літоўскіх бізнесменаў. Група гандляроў нават правяла тыднёвую галадоўку побач з будынкам парламента.

Міхась КАРПОВІЧ



На здымку: Далюс Басціс (справа) вяртае віцэ-спікеру літоўскага Сейма Андрусу Кубілюсу свой медаль.

Беларусь—Россия

«Последний рубеж»

Российская коммунистическая газета «Завтра» опубликовала 4 декабря большую (на целую страницу) статью своего минского автора Е.Ростикова под названием «Последний рубеж».

Напомнив для начала о том, что к 1991 году Беларусь была одной из самых милитаризованных советских республик, что военные объекты занимали около 10% ее территории (в то время как по всему Советскому Союзу этот процент не превышал 2), на которых было развернуто примерно 5% всех Вооруженных сил СССР, а также рассказав о борьбе белорусского президента против вывода с территории республики ядерного оружия, автор статьи переходит к описанию сегодняшнего состояния вооруженных сил и военной политики, проводимой А.Лукашенко.

Журналист считает, что противостояние А.Лукашенко и Запада проходит не только по линии поселка «Дрозды», но и по линии демонтажа оставшихся ядерных вооружений России. В то время как Украина уже приступила к очередному этапу ликвидации ядерного потенциала — уничтожению ядерной инфраструктуры (взрываются шахты для запуска ракет), А.Лукашенко подобный процесс всячески тормозит. В Беларуси успели взорвать только одну из имеющихся 81 бетонной площадки от выведенных в Россию ракет СС-25. Белорусский президент весьма отрицательно относится к ликвидации этих сооружений, заявляя, что *«стартовые площадки Беларуси не мешают. А оставлять после себя потомкам искорененную землю мы не будем»*.

По словам журналиста, *«Беларусь продолжает оставаться страной, которая может постоять не только за себя, но и за своих союзников. Сокращать свои войска или что-нибудь уничтожать республика более не намерена»*. Сегодня белорусские ПВО несут круглосуточные боевые дежурства и контролируют воздушное пространство от Киева до Риги. Хотя это обходится республике довольно дорого, тем не менее, А.Лукашенко заявляет: *«Беларусь будет не только содержать войска ПВО, но и модернизировать все комплексы и системы. И я бы предостерег и Францию, и другие страны, и Великобританию, которые считают, что они недосягаемы. Это вовлечет их в такую бойню, что будет жарко всей Западной Европе. Они распоясались, эти господа, когда Советский Союз исчез, они распоясались до крайности»*.

Подготовил
Михаил ГРИГОРЬЕВ

В Литве поймали шпиона

Информация о нем держится в тайне

В Литве — сенсация! Впервые (включая и довоенный период) здесь задержан «агент иностранной разведки, чьи действия на территории Литвы подпадают под определение — шпионаж». Имя шпиона и страна, на которую он работал, держится в тайне.

Единственный достоверный факт — в пятницу у президента Валдаса Адамкуса побывали три контрразведчика Комитета госбезопасности Литвы, а также его генеральный директор Мечисловас Лауринкус и получили от президента личную благодарность за успешную операцию.

По официальным сообщениям, агент иностранной разведки пытался передать иностранному государству информацию, составляющую государственную тайну Литвы. По неофициальным — задержан гражданин России, вероятно, связанный с дипломатической службой, работавший в пользу либо России, либо Беларуси. Что же касается «гостайны», то предположительно речь идет о системе охраны одного из стратегических объектов.

Операция продолжалась несколько месяцев, о ее результатах было доложено в четверг. Ожидается, что человек, чьи действия были квалифицированы как шпионаж, не будет объявлен персоной нон грата. Судя по имевшим место ранее аналогичным инцидентам, ему будет предоставлена возможность под благовидным предлогом покинуть страну. Решение не поднимать шума мотивируется «желанием поддерживать дружеские отношения с соседними государствами».

Татьяна КОМОРСКАЯ

«на игле»

Наркоманские круги замкнуты исключительно на себя. У «кетаминщиков» свой круг общения, у «героинщиков» — свой, то же с «кокаинистами». И все они не любят «опиюшников», за что — уже говорилось. Поэтому работа среди наркоманов трудна всем: медикам, журналистам, милиции. Невозможно, знакомясь с наркоманом одного круга, выйти на другой. Приходится «втираться в доверие» очень и очень долго, потом все начинать заново с другими людьми.

Государство

Государство может завезти наркотики. Государство может плохо следить за использованием наркотических препаратов. Государство может безуспешно воевать с наркоторговцами. Лишь одного оно не может — вылечить наркомана от его болезни. Причем этого не может не только наше государство, этого не научилось делать ни одно государство мира.

В Беларуси, как и в других странах, сейчас принят один основной способ лечения — метадоновый. Наркоману, попавшему в лечебницу, просто снимают ломки, заменяя привычный наркопрепарат более слабым: реланиумом или метадоном. Ничего, кроме снятия ломок, это не приносит. После выхода из лечебницы наркоман попадает в знакомую среду и снова берется за шприц.

Наркомания — социальная болезнь не только потому, что ее выбирают как иллюзорный мир, как способ бегства от не удовлетворяющего человека мира реального. Наркомания неотделима от своего микросоциума. Возвращаясь после курса лечения, человек не должен попадать в знакомое окружение, иначе это окружение будет напоминать о минутах пережитого кайфа. Государство же не может предоставить человеку возможность изменить свой микросоциум. Наше государство в особенности — один институт прописки чего стоит.

Наркотики — это еще и субкультура, на которой просто «завязана» молодежь. Что нормальный человек может чувствовать, когда слушает хиты типа «Иван Кетаминов» или «Возвращаюсь раз под вечер, накурившись гашиша...»? Наркоман при этом чувствует совсем другое. Оно знает, что наркотики — такая же вечная тема для разговора, как и любовь, о них можно говорить сутками напролет. Без напоминаний выйти из субкультуры наркомании нельзя. Без ухода из этой субкультуры вылечиться практически невозможно.

Негосударство

То, что не способно сделать государство, достаточно успешно делают негосударственные институты. Наркоман должен сам хотеть вылечиться — без этого ему никто не поможет. Единственным эффективным методом лечения согласно на это наркомана была, есть и остается коммуна. Можно сомневаться в жизнеспособности этого института, но пока не приходится сомневаться в его эффективности.

Можно долго говорить о том, что организованная коммуна живет, оторвавшись от действительности, от цивилизации, за счет тяжелой работы, твердой дисциплины и жесткого общественного согласия в пределах коммуны. Но, как ни странно, бывшим наркоманам все равно, за счет чего они выжили и стали полноценными членами пусть даже только своего общества. Они будут считать это общество полноценным, поскольку другое, «государственное общество» смогло их бросить, но не смогло им помочь.

Сейчас процесс создания «наркоманских» коммун активно проходит в России. В США они созданы давно, есть даже автономный «наркоманский» город. Коммуны создаются при активной поддержке церквей. Причем, и у нас, и в России наибольшую поддержку оказывают не традиционные конфессии, имеющие государственную поддержку церкви, а «новые течения»: адвентисты, протестанты и т.п. На данный момент церковь и коммуна принесли наркоманам гораздо больше пользы, чем все государства вместе взятые.

Работа среди наркоманов очень сложна, но очень благодарна. После того, как они станут тебе доверять — это очень открытые и душевные люди, со своими жизненными трагедиями и проблемами.

Кто захочет «поработать» в этой среде, тому можно дать один полезный совет. Идя в место, где могут предложить «уколоться», обязательно берите с собой бутылку водки (можно больше). Наркотики с алкоголем несовместимы. Главное при этом не увлечься и помнить, что алкоголь приравнен Всемирной организацией здравоохранения к наркотику.

P.S. Автор благодарит за помощь в подготовке материала Аналитическо-исследовательский союз «XXI век» и Фонд социальных инициатив и исследований им.братьев Луцкевичей. Всем спасибо.

Дуэлянты, падрыхтуйце вашы шаблі...

Уладзімір АРЛОЎ

Такі сродак высвятлення адносінаў, як дуэлі, у беларускім грамадстве ўжо не практыкуецца восем дзесяцігоддзяў. Але на працягу многіх стагоддзяў у нас усё было, як у людзей.

Гісторыя дуэляў, або двубояў на нашай зямлі сягае ў ранняе Сярэднявечча, калі яны існавалі ў выглядзе судовых паядынкаў-ардаліяў. Іх удзельнікі ўступалі ў двубой у прысутнасці святароў і прадстаўнікоў улады.

Другім відам былі паядынкі ў час вайсковых дзеянняў, калі бакі рабілі спробу вырашыць справу не бітвай, а асабістым адзінаборствам ваяводаў ці выбраных ваяроў. Са школьных гадоў кожны памятае пра паядынак Перасвета і Чалубея напярэдадні Кулікоўскай бітвы, у якой, як вядома, удзельнічалі і беларускія палкі.

Пад уплывам Заходняй Еўропы ў Беларусі ўжо ў XIV стагоддзі нярэдка адбываюцца рыцарскія адзінаборствы, у тым ліку і вядомы паядынак брата Ягайлы пінскага князя Нарымунта з нямецкім рыцарам з войска князя Вітаўта, які ў 1390 годзе імкнуўся адваяваць у Ягайлы Вільню.

У XVI стагоддзі ў Вялікім Княстве Літоўскім надыходзіць, так бы мовіць, эпоха класічных двубояў. Наш знакаміты Статут 1588 года меў адмысловы артыкул, які забараняў двубоі і прадугледжваў для іх удзельнікаў адміністратыўныя і крымінальныя санкцыі нават да пакарання смерцю.

Разам з тым забарона дуэляў была няпоўнай. Вялікі князь ці гетман маглі даць адпаведны дазвол, калі на тое будуць «прычыны вялікія і выдатныя». Да разраду менавіта такіх прычын можна аднесці абразлівы ліст, дасланы ў 1581 годзе вялікаму князю літоўскаму Стэфану Баторыю маскоўскім царом Іванам Грозным. Кіраўнік нашай дзяржавы адказаў выклікам на дуэль: «Вазьмі зброю, сядзь на каня, сыдзіся са мной у абраны час, пакажы, які ты муж і які давяраеш праўдзе сваёй; рассудзім спрэчку нашу мячом, каб меней крыві хрысціянскай лілося». Маскоўскі валадар праўдзе сваёй, відаць, зусім не давяраў, бо не знайшоў мужнасці даць хаця б пісьмовы адказ, чым канчаткова пераканаў Еўропу, што ў асобе рускага цара яна мае справу з азіяцкім тыранам.

Варты свайго гаспадара быў і маскоўскі ваявода Шуйскі, які ў тым самым 1581 годзе атрымаў у час аблогі Пскова абгрунтаваны выклік на двубой ад каронната гетмана Яна Замойскага, але на прызначанае месца паядынку, парушыўшы слова гонару, не з'явіўся.

Нягледзячы на забароны, двубоі — найперш сярод людзей шляхецкага стану — рабіліся ўсё больш пашыранымі. Дэпутаты соймаў і соймікаў хапаліся за пісталеты і шаблі пры вырашэнні спрэчных пытанняў. Афіцэры на вайне таксама выкарыстоўвалі гэтыя аргументы ў якасці апошніх. Хапала і тых, для каго бясконцыя дуэлі ператвараліся ў спосаб жыцця. Да апошніх належаў князь Багуслаў Радзівіл, якому на радзіме было ўжо цесна, і ён, падрыхтаваўшы добрыя клінкі і пісталеты, выправіўся ў Еўропу, дзе дзесяткі разоў выступаў ініцыятарам двубояў, за што аднойчы (праўда, на адзін толькі дзень) быў кінуты ў Бастылію.

Гарадзенскі сойм Рэчы Паспалітай у 1678 годзе прыняў яшчэ адну пастанову пра забарону дуэляў. У гэты час моднымі пачынаюць рабіцца двубоі, прычынаю якіх з'яўляюцца найпрыгажэйшыя ў свеце беларускія жанчыны. Паколькі іх прыгажосць ад стагоддзя да стагоддзя толькі расцвітала, колькасць дуэляў таксама няўхільна павялічвалася. Прадстаўнікі славутых магнацкіх родаў Людвік Міхал Пац і Адам Юры Чартарыйскі двойчы выходзілі да бар'ера з прычыны кахання да Ганны Сапежанкі, што ў 1817 годзе ўрэшце выбрала Чартарыйскага.

Наш суайчыннік расійскі пісьменнік Фадзей Булгарын, які паходзіў з-пад Узды, пісаў пра тыя часіны: «І на вайне, і ў мірныя гады мы шукалі небяспекі, каб сцвердзіць сваю смеласць і зухаватасць. Баляваць, біцца на шаблях, буяніць — усё гэта было зместам нашага вайсковага жыцця. Буянства падлягала пакаранню, але не пляміла афіцэрскага гонару, калі не выходзіла з пэўных межаў. Страляліся вельмі рэдка, але секліся за любую драбніцу. А пасля такіх дуэляў зазвычай было замірэнне, а потым балюшка і сяброўства».

Двубоі адбываліся і ў першыя гады савецкай улады. На гэты конт у арміі бальшавікоў нават праводзіліся дыскусіі. Як няцяжка здагадацца, «па просьбах працоўных» дуэлі былі неўзабаве забароненыя.

Найноўшая гісторыя Беларусі сведчыць, што шматвяковая традыцыя нашых продкаў не зусім канула ў Лету. Даводзілася чуць, што ў сярэдзіне 80-х гадоў пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч, вядомы сваімі выступамі ў абарону беларускай мовы, выклікаў на дуэль калегу па літаратурным цэху Івана Чыгрынава. Паведамленняў пра тое, каб хтосьці пасылаў выклік Уладзіміру Замяталіну, не паступала.





Маскоўскі цар Іван Грозны (злева) у 1581 годзе ўхіліўся ад дуэлі з кіраўніком нашай дзяржавы Стэфанам Баторыем.

ГАСТРОЛІ

Восем вечароў з расійскім тэатрам

Сёння ў Мінску пачынаюцца гастролі Тэатра імя М.Ярмолавай

Адзін з буйнейшых тэатраў Масквы, Тэатр-цэнтр імя Марыі Ярмолавай, прыязджае на гастролі ў сталіцу Беларусі. На працягу дзесяці дзён, з 11 па 21 снежня, мінчукі ўбачаць восем пастановак, галоўным чынам так званага «лёгкага», камедыйнага рэпертуару.

11 снежня, у дзень адкрыцця гастроляў (а таксама 14 снежня) ярмолаўцы пакажуць нам «Скрыжаванне» — своеасаблівы працяг вядомай калісьці п'есы «Варшаўская мелодыя», у якой распавядалася, як савецкія бюракраты паставілі крыж на каханні нашага студэнта і польскай дзяўчыны (таму, што яна іншаземка). Героі «Варшаўскай мелодыі» зноў сустракаюцца праз некалькі дзесяцігоддзяў. У гэтым спектаклі на сцэну выйдзе славутая Эліна Быстрыцкая, народная артыстка СССР.

Імпрэзу паводле рускага савецкага класіка Аляксея М.Талстога «Як кахаю я вас» гастралёры пакажуць 12 снежня — гэта будзе распавяд пра каханне ў стылістыцы старога рамана. 13 снежня можна паглядзець «Паненку-сялянку» паводле пушкінскай «аповесці Белкіна».

15 і 18 снежня маскоўскія госці разыграюць экстравагантную камедыю Бернарда Шоу «Вялікая Кацярына», дзеянне якой разгортваецца пры двары расійскай імператрыцы Кацярыны II. Яшчэ адзін класік англамоўнага тэатра — амерыканец Тэнесі Ўільямс — будзе прадстаўлены 16 і 17 снежня пастаноўкай «Бітва анёлаў».

Рускую правінцыю XIX стагоддзя, убачаную вачыма прыезджага немца, апісаў у сваёй аповесці «Жалезная воля» М.Ляскоў. Інсцэніроўку гэтага класічнага твора маскоўскія артысты пакажуць 19 снежня.

Адна з найбольш прывабных пастановак гастрольнай афішы — «Вечар камеды» (20 снежня). За адзін вечар гледачы ўбачаць чатыры кароткія навэлы — Б.Шоў, К.Фарцюно, О'Генры і Э.дэ Філіпа. Гэта нешта накшталт калейдаскопа, у якім вы ўбачыце ў святле камеды англічан, французаў, амерыканцаў ды італьянцаў. Завершацца гастролі тэатра Ярмолавай 21 снежня гістарычнай драмай «Таямніцы Шынонскага замка».


Усе спектаклі пройдуць у памяшканні Рускага тэатра (які тым часам будзе гастраляваць у Маскве). Квіткі прадаюцца ў тэатральных касах, кошт — 100–200 тысяч рублёў.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Даты і лёсы

11 снежня

1803. Нарадзіўся французскі кампазітар-рамантык Гектар Берліёз, аўтар оперы «Рамэо і Джульета».



1843. Нарадзіўся адзін з заснавальнікаў бактэрыялогіі нямецкі фізік Роберт Кох ***(на здымку злева)***, Нобелеўскі лаўрэат 1905 г. У 1882 г. ён адкрыў бацылы сухотаў (палачкі Коха), а праз год — мікробы халеры.



